на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941−1944): анализ и итоги», 2012. К. И. Козак подготовил и опубликовал около 100 научных статей и тезисов, в том числе на английском, немецком, французском и польском языках. Они посвящены различным вопросам архивоведения и проблематике исследований Второй мировой войны. К. И. Козак является редактором и составителем более 60 изданий, отражающих воспоминания и судьбы участников Второй мировой войны, в том числе партизанского движения, трагедию жертв различных векторов нацистской политики на оккупированной территории Беларуси.

Успешна и педагогическая деятельность Кузьмы Ивановича. Он работает с аудиторией различного возраста и степени подготовки: учащимися столичных и районных школ республики, студентами отечественных и зарубежных учреждений высшего образования, слушателями курсов повышения квалификации различных отраслевых организаций Беларуси. Его учебно-методическая работа основывается на подготовленных им пособиях, в том числе «Архивоведении Беларуси» в двух частях (в соавт. с М. Ф. Шумейко и В. Д. Селеменевым).

Под руководством Кузьмы Ивановича Козака подготовлена и защищена кандидатская диссертация.

Историк проводит большую общественную работу. Его участие в телевизионных проектах, теле- и радиопередачах делает эфир богатым на исторические факты и увлекательные дискурсы в историю, что привлекает к историческим проблемам внимание аудитории. Он – один из авторов-составителей материалов и документов, которые нашли отражение на страницах книг серии «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка», посвященных таким белорусским районам, как Октябрьский, Поставский, Смолевичский, а также г. Жодино.

Кузьма Иванович награжден Почетной грамотой БГУ.

Коллектив кафедры источниковедения исторического факультета поздравляет К. И. Козака с юбилеем, желает ему новых творческих побед и свершений на благо нашего университета, белорусской науки, а также культуры подрастающего поколения.

## ТАДЭВУШ АНТОНАВІЧ НАВАГРОДСКІ



Споўнілася 50 гадоў выдатнаму беларускаму этнолагу, кандыдату гістарычных навук, дацэнту, загадчыку кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Тадэвушу Антонавічу Навагродскаму.

Т. А. Навагродскі нарадзіўся 6 лістапада 1965 г. у в. Арцюшы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1984 г. ён закончыў Ваўкавыскае педагагічнае вучылішча і паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Праз год навучання быў прызваны ў армію, два гады служыў танкістам, затым працягваў вучобу на гістарычным факультэце, які закончыў з адзнакай у 1991 г. У гэтым жа годзе паспяхова здаў уступныя экзамены і быў залічаны ў вочную аспірантуру Акадэміі навук Беларусі па спецыяльнасці «Этналогія». Падчас навучання Т. А. Навагродскі падрыхтаваў арыгінальную кандыдацкую дысертацыю аб традыцыях харчавання беларускага народа. Пасля заканчэння аспірантуры працаваў навуковым супрацоўнікам аддзела этналогіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дацэнтам кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2001 г. на гістарычным факультэце БДУ была створана кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, дзе навуковец працаваў спачатку дацэнтам, а з 2008 г. – загадчыкам. Менавіта ў дадзены перыяд у поўнай меры праявіўся яго талент лектара, даследчыка, кіраўніка. З вялікім майстэрствам ён выкладае курс беларускай этналогіі, гістарыяграфіі, знаёміць студэнтаў з метадамі палявых этнаграфічных даследаванняў, якія яны выкарыстоўваюць у экспедыцыях кафедры, што праводзяцца кожны год у розных рэгіёнах Беларусі.

Насычаную выкладчыцкую дзейнасць Т. А. Навагродскі паспяхова спалучае з навуковай работай: распрацаваў шэраг тэарэтычных праблем беларускай этналогіі, у прыватнасці разгледзеў месца беларускай этналогіі ў сістэме гуманітарных навук, выкарыстанне ў ёй катэгорыі «культура», прааналізаваў крыніцы беларускай этналагічнай навукі, яе метады і прыёмы збірання палявых матэрыялаў. Каштоўнымі з'яўляюцца працы Т. А. Навагродскага, прысвечаныя гісторыі беларускай этналагічнай навукі, асабліва «Выданне "Беларусы" і яго ўклад у этнаграфічнае вывучэнне Беларусі», «Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі ў 90-х гадах XX стагоддзя», «Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст.». Вялікая колькасць навуковых прац этнолага прысвечана традыцыям харчавання беларускага народа. Сярод іх вылучаюцца манаграфіі «Традыцыі народнага харчавання беларусаў» і «Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стст.». У апошняй даследуюцца гісторыя этналагічнага вывучэння традыцый

харчавання беларусаў, стравы ў сістэме харчавання беларускага этнасу, тэхналогіі іх прыгатавання, трапезы, развіццё традыцый харчавання ў першай палове XX ст. і іх трансфармацыя ў другой палове XX ст. Гэта манаграфія з'яўляецца істотным укладам у беларускую этналагічную навуку.

Як загадчык кафедры, Т. А. Навагродскі звяртае ўвагу на падрыхтоўку вучэбных дапаможнікаў. Ім асабіста падрыхтаваны вучэбны дапаможнік «Традыцыйная культура харчавання беларусаў». Пад кіраўніцтвам навукоўца і з яго ўдзелам створаны вучэбна-метадычны дапаможнік «Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве».

Гісторык актыўна ўдзельнічае ў папулярызацыі навуковых ведаў. Ён падрыхтаваў серыю артыкулаў для Беларускай энцыклапедыі ў 18 тамах, энцыклапедыі «Гісторыя Беларусі» ў 6 тамах, энцыклапедыі «Беларускі фальклор» у 2 тамах, Энцыклапедыі беларускай кухні.

Значны ўклад унёс Т. А. Навагродскі ў падрыхтоўку навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі, асабіста падрыхтаваў 3 кандыдатаў навук, якія паспяхова працуюць у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь і замежных краін.

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўніверсітэта навуковец узнагароджаны Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, граматамі БДУ.

Т. А. Навагродскі актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Ён з'яўляецца членам вучонага савета гістарычнага факультэта, членам камісіі рэспубліканскага конкурсу на лепшую аграсядзібу ў Рэспубліцы Беларусь, экспертам грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы», членам экспертнай камісіі па рэстытуцыі культурных каштоўнасцей пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь, членам семінара па экспертызе кандыдацкіх дысертацый па этналогіі.

Свой юбілей гісторык сустракае ў росквіце творчага таленту, поўны цікавых ідэй і планаў. Навуковая грамадскасць, калегі, сябры, вучні сардэчна віншуюць шаноўнага Тадэвуша Антонавіча і жадаюць яму новых творчых дасягненняў.

***М. Ф. Піліпенка***,
член-карэспандэнт НАН Беларусі,
доктар гістарычных навук,
прафесар кафедры этналогіі,
музеялогіі і гісторыі мастацтваў
гістарычнага факультэта БДУ